эпіпраектар, дыяпраектар — візуальныя тэхнічныя сродкі статычнай праекцыі. Тэлевізійныя комплексы, відэапраектары — сродкі дынамічнай праекцыі.

Значнае месца ў выкладанні тэхнічных сродкаў займае тэхніка гукавога забеспячэння, аўдыторны гукавы комплекс, гукавое суправаджэнне праекцыі і інш.

Разглядаецца пераход ад аналавага віду сігнала да лічбавага з мэтай аб'яднання ўсіх тэхнічных сродкаў у адзін лічбавы інфармацыйны комплекс.

**Бураўкін А.Г.,** *дацэнт*

# АЛГЕБРА МУЗЫКІ

Музычнаму ўзору адпавядае алгебраічная канструкцыя. Разглядаюцца дзве аперацыі: перамнажэнне і складанне.

Здабытак элементаў адлюстроўвае паслядоўнасць музычных гукаў мінімальнай стандартнай працягласці ў часе. Складанне ўвасабляе адначасовае гучанне.

Гэтыя аперацыі ўтвараюць традыцыйную алгебраічную структуру — свабодную алгебру з дадатковымі тоеснасцямі (PI-алгебру). Аперацыі асацыятыўныя і звязаныя паміж сабой дыстрыбутыўнымі законамі.

Музычны ўзор адлюстроўваецца паслядоўнасцю базавых алгебраічных канструкцый і спалучанай з кожнай такой канструкцыяй паслядоўнасцю алгебраічных марфізмаў, што дазваляе прадставіць у фармалізаваным выглядзе такія працэсы, як развіццё або распрацоўка музычнай тэмы.

Акрамя таго, кожнай базавай форме адпавядае спароджаны ёю Т-ідэал, які адлюстроўвае сукупнасць магчымых музычных распрацовак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыведзеная алгебраічная мадэль дазваляе ажыццяўляць дакладны структурны аналіз музычнага ўзору.

**Зыгмантовіч С.В.**, *дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ

На фоне сённяшніх пераўтварэнняў неабходнасць змен у бібліятэчнай справе становіцца ўсё больш відавочнай. На першы план вылучаецца задача павышэння якасці прафесійнай падрыхтоукі спецыяліста, узровень якой залежыць ад агульнай, (у тым ліку, і інфармацыйнай, бібліяграфічнай) культуры асобы бібліятэкара-бібліёграфа.

Асэнсаванне інфармацыйнай культуры як асаблівага, адносна самастойнага аспекту культуры стала магчымым у выніку распрацоўкі інфармацыйнага падыходу да пазнання рэчаіснасці, развіцця ўяуленняў аб інфармацыйным грамадстве, у якім інфармацыйныя рэсурсы па сваёй значнасці не саступаюць энергетычным, фінансавым і іншым стратэгічным рэсурсам, а сама інфармацыя ацэньваецца як эканамічная катэгорыя. Праявамі гэтага асэнсавання ў бібліятэчнай сферы з`явіліся такія арганізацыйныя вынікі, як стварэнне Міжнароднай Акадэміі інфарматызацыі, перайменаванне бібліятэчных факультэтаў у ВНУ культуры ў факультэты бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, правядзенне шматлікіх канферэнцый па абмеркаванню праблем інфарматызацыі грамадства і інфармацыйнай культуры, увядзенне ў ВНУ культуры спецыяльных вучэбных дысцыплін, такіх як «Інфармацыйная культура асобы» і г.д.

На сённяшні дзень адсутнічае агульнапрынятае азначэнне паняцця «інфармацыйная культура». Можна гаварыць аб інфар-